**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2016 г.

## Мерапрыемствы да Году культуры

1 лютага

Гадзіна літаратурнага партрэта «Крыніца творчасці - сучаснасць», прысвечаная 95-годдзю з дня нараджэння І. П. Шамякіна, сабрала ў бібліятэцы вучняў сярэдніх класаў. Расказ пра жыццё і творчасць пісьменніка суправаджаўся паказам электроннай прэзентацыі "Ад сына лесніка да народнага пісьменніка і акадэміка". Да мерапрыемства афармлена кніжная выстава "Сейбіт дабрыні і чалавечнасці".

Лукская СБ, 14 чал.

1 лютага

Напярэдадні 95-годдзя з дня нараджэння І. П. Шамякіна ветліва расчыніла дзверы літаратурная гасцёўня "Голас сумлення і годнасці". Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава "Сэрца на далоні часу". Удзельнікі ЛПГ "Крыніца" выступілі перад моладдзю з літаратурна-музычнай кампазіцыяй "Талент, дадзены богам". Цікавай і запамінальнай стала для моладзі і электронная прэзентацыя "На шляху майстэрства".

Батчынская СБ, 25 чал.

5 лютага

Тэатральна-музычны куфэрак "Вянок казак" правялі працаўнікі бібліятэкі для сваіх маленькіх чытатоў. Увазе маленькіх наведвальнікаў дзіцячых садоў горада лялечны тэатр "Казка" падрыхтаваў спектакль "Красная шапочка". Дзеці актыўна адказвалі на пытанні тэатралізаванай віктарыны і ўсе разам спявалі вядомыя песні з мультфільмаў.

ДБ, 73 чал.

15 лютага

Краязнаўчае падарожжа ў мінулае "Что предметы старины рассказать тебе должны" праведзена супрацоўнікам бібліятэкі. Таксама арганізаваны "Куток старажытнага побыту". Акрамя экспанатаў бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з кнігай М. Маляўкі "Сядзіба або Хата з матчынай душою", якая дапамагла ім больш падрабязна даведацца аб тым, як жылі, працавалі і адпачывалі нашы продкі. На заканчэнне дзеці паглядзелі мультфільм па матывам беларускай народнай казкі "Лёгкі хлеб".

Восаўская СБ, 17 чал.

22 лютага

На літаратурнае рандэву, прысвечанае творчасці і жыццёваму шляху К. Крапівы, "Народ з яго здружыўся смехам" сабраліся старшакласнікі сярэдняй школы. Ўдзельнікі спаткання пазнаёміліся з выставай "Майстар, якому прырода адкрыла запаветнае слова....", адказвалі на пытанні літаратурнай віктарыны "Хто смяецца апошнім" і аналізавалі найбольш вядомыя сатырычна-гумарыстычныя творы пісьменніка.

Гарадзецкая СБ, 11 чал.

26 лютага

Конкурс баек К. Крапівы “Сэрцам роднага слова храніся” правялі ўдзельнікі літаратурна-паэтычнай групы бібліятэкі. Пераможцаў вызначалі агульным галасаваннем, а бібліятэкар узнагародзіла ўдзельнікаў памятнымі прызамі. Да мерапрыемства падрыхтавана выстаўка кніг “Дарога ў вялікае жыццё”.

Тэвельская СБ, 30 чал.

## <u>Мерапрыемствы да тыдня роднай мовы</u>

12 лютага

Літаратурная гадзіна "Хараство роднай мовы." Вучні пачатковай школы даведаліся, як складалася беларуская літаратурная пісьмовая мова. Адказвалі на пытанні віктарыны "Падумай і адкажы", ўдзельнічалі ў конкурсе "Паспрабуй перакладзі". Пазнаёміліся з выставай "Роднай мовы гук чароўны", дзе прадстаўлены кнігі з серыі "Бібліятэка беларускай дзіцячай літаратуры". Таксама ў бібліятэцы стартавала акцыя "Размаўляй са мной па беларуску!".

Балоцкая СБ, 12 чал.

22 лютага

Бібліятэка сумесна з работнікамі Дома культуры правяла інфармацыйна–пазнавальную гадзіну “Я мовай роднай ганаруся”. Дзеці акунуліся ў чароўны свет роднай мовы, ўдзельнічалі ў інтэлектуальнай гульні, складалі прыказкі, адгадвалі загадкі-жарты, слухалі беларускія песні ў выкананні работнікаў Дома культуры, знаёміліся з выставай “Мова родная, вечна жывая”.

Навасёлкаўская СБ, 40 чал.

22 лютага

Вусны часопіс "Звіні, мая светлая родная мова!" прайшоў для вучняў малодшых класаў. Прысутныя даведаліся пра гісторыю ўзнікнення дня роднай мовы, пра неабходнасць захавання беларусскай мовы. Адказвалі на пытанні віктарыны "Моўныя скарбы роднага краю", адгадвалі загадкі, удзельнічалі ў конкурсах "Скорагаворкі", "Назаві па-беларуску", "Назаві адным словам", прынялі ўдзел у гульні "Эстафета". Пазнаёміліся з кніжнай выставай "Чытаем на роднай мове".

Лелікаўская СБ, 15 чал.

22 лютага

Бібліятэкай сумесна з цэнтрам культуры і вольнага часу падрыхтавана літаратурна–музычная кампазіцыя “Багата, родная ты мова…”. Бібліятэкарам прадстаўлена кніжная выстава “Ад роднай мовы і культуры – да чалавецтва крок зрабі” з літаратураю аб нашых вядомых паэтах і пісьменніках, сапраўдных патрыётах Бацькаўшчыны. Ўдзельнікамі літаратурна-паэтычнай групы “Ліра” чыталіся вершы з незвычайна цудоўным прызнаннем да роднай мовы. Парадаваў гледачоў беларускімі песнямі народны ансамбль музыкі і песні “Ясніца”.

Стрыгаўская СБ, 30 чал.

22 лютага

Літаратурна-музычная кампазіцыя “Размаўляй са мной па-беларуску!” праведзена сумесна з работнікамі бібліятэкі і Дома культуры. Ўдзельнікі мерапрыемства даведаліся аб гісторыі ўзнікнення свята, яго значэнні, адказвалі на пытанні віктарыны аб гістарычных асобах, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай мовы і культуры. Гучалі вершы і песні аб Беларусі у выкананні ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці Арэхаўскага Дома культуры.

Арэхаўская СБ, 30 чал.

22 лютага

Свята "Гучы, родная мова!" правяла бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і досугу і Домам рамёстваў для вучняў сярэдняй школы. Дзеці удзельнічалі ў конкурсах "Ведай і размаўляй", адказвалі на пытанні віктарыны "Вядомыя і знакамітыя", знаёміліся з беларускімі выданнямі-юбілярамі, з выставай Дома рамёстваў, выконвалі жартоўныя заданні, складалі тэлеграмы, збіралі галаваломкі і адгадвалі загадкі. Пераможцы атрымалі ў якасці прызоў льготныя чытацкія білеты на права карыстання дадатковымі паслугамі бібліятэкі.

Дзівінская СБ, 38 чал.

22 лютага

Агляд літаратуры «Расповяды пра каханне – беларускія бестселеры: новыя, старыя і нечаканыя…» праведзены працаўніком бібліятэкі для сваіх чытачоў. Вучні старэйшых класаў сярэдняй школы пазнаёміліся з творамі В. Гапеева, А. Бадака, кнігамі серыі "Вера. Наддзея. Любоў". Агляд суправаджаўся паказам відэапрэзентацыі.

Лукская СБ, 12 чал.

22 лютага

Ў актавай зале СШ №8 прайшла літаратурная гадзіна "Сэрцам роднага слова краніся". Вучні разам з настаўнікамі ўзгадалі гістарычны шлях роднай мовы, абмяркоўвалі беларускую літаратуру, чыталі вершы Н. Гілевіча, П. Макаля, С. Грахоўскага, М. Чарняўскага. Своеасаблівую атмасферу стварылі кніжная выстава "Роднай мовы гук чароўны", прагляд літаратурна-музычнай кампазіцыі "Вобразная, вольная, пявучая, мова беларуская мая", цікавыя заданні і конкурсы, накіраваныя на кемлівасць і эрудзіраванасць вучняў.

ЦБ, 62 чал.

23 лютага

Літаратурна-паэтычная група бібліятэкі выступіла з праграмай "Беларускай байкі ўладары". Мерапрыемства прысвечана Міжнароднаму Дню роднай мовы, 120-годдзю з дня нараджэння К. Крапівы. Прысутныя пазнаёміліся з творчасцю юбіляра і яго паплечнікаў па пяру. Выступленне суправаджалася дэманстрацыяй электроннай прэзентацыі і чытаннем твораў з кніг, прадстаўленых на кніжнай выставе.

Залеская СБ, 40 чал.

24 лютага

Літаратурныя вячоркі "Жыве ў вяках беларускае слова". Ўдзельнікі літаратурна-паэтычнай групы "Крыніца" прадставілі ўвазе гледачоў тэатралізаванае прадстаўленне "Пароль неўміручасці – роднае слова". Ў бібліятэцы на працягу ўсяго мерапрыемства гучала беларуская мова ў вершах, прыказках, прымаўках, загадках і песнях. Усе прысутныя пазнаёміліся з выставай "Квітней, родная мова".

Батчынская СБ, 25 чал.

## **Мерапрыемствы да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл РБ і Дня памяці воінаў – інтэрнацыяналістаў**

12 лютага

Гадзіна памяці “Прикоснись сердцем к подвигу” прайшоў для старэйшых класаў. Бібліятэкар пазнаёміла удзельнікаў мерапрыемства з гістарычнымі падзеямі вайны ў Афганістане, з кнігай «Памяць», дзе можна знайсці імёны загінулых у баявых дзеяннях у Афганістане. Акцэнт быў зроблены на аповед пра землякоў, якія пайшлі на Афганскую вайну. Добрым дадаткам да мерапрыемства стала кніжная выстава “А памяць жыве…” і відэапрэзентацыя “Горькая память Афганской войны”.

Батчынская СБ, 25 чал.

18 лютага

Удзельнікамі гісторыка-літаратурнага ўрока мужнасці, прысвечанага Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў “Живая память”, сталі студэнты Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага коледжа. Ўспамінамі пра афганскія падзеі і свой удзел у вайсковых дзеяннях падзяліўся падпалкоўнік Валянцін Сямёнавіч Бондарук, які ў якасці камандзіра верталётнага экіпажа тройчы лётаў у Афганістан.

ЦБ, 54 чал.

19 лютага

Гульнёва-пазнавальная гадзіна “Держава армией крепка” адкрылася аповедам пра вялікіх расійскіх палкаводцаў. Дзеці з цікавасцю слухалі гісторыю іх перамог, разглядалі кнігі, дзе дэманстраваліся вайсковыя дзяржаўныя ўзнагароды мінулага. Прымалі актыўны ўдзел у конкурсах, спартыўных спаборніцтвах “На все руки мастер”, “Меткий стрелок”, “Весёлые гонки” і інш.

Бельская СБ, 13 чал.

21 лютага

На пасяджэнне клуба “Сонейка” “Мужскі сягодня дзень” сабраліся прадстаўнікі трох пакаленняў розных сем'яў. Бібліятэкар арганізавала вясёлую гульню, падзяліўшы прысутных на каманды. Кожная каманда адгадвала загадкі, рэбусы, сканворды, малявала малюнкі. Ў канцы мерапрыемства дзеці падарылі сваім бацькам і дзядам падарункі і праспявалі песню Я. Акіма “Мужчына ў доме”.

Паляцічская СБ, 14 чал.

## **Іншыя мерапрыемствы**

5 лютага

Інфармацыйны агляд-гульня “Ты журналы полистай – миллион чудес узнай”. Да мерапрыемства арганізаваны выстава перыядычных выданняў для дзяцей: часопісы “Незнайка”, “Кважды-ква”, “Рюкзачок” і інш. Маленькія наведвальнікі ўважліва разглядалі часопісы, адказвалі на пытанні. Бібліятэкар прапанавала дзецям відэаагляд па часопісам і гульні ў ДК. Лепшыя ўдзельнікі ўзнагароджаны падарункамі.

Магдалінская СБ, 30 чал.

12 лютага

Літаратурная гадзіна “Для маленьких и больших”, прысвечаная 110-годдзю з дня нараджэння А. А. Барто прайшла для ўдзельнікаў аматарскага клуба “Светлячок”. Маленькія гледачы пазнаёміліся з біяграфіяй і творчасцю А. Барто, чыталі вершы, актыўна адказвалі на пытанні віктарыны. Ўвазе дзяцей прадстаўлена кніжная выстава

з нагоды юбілейнай даты пісьменніцы. Ўсе наведвальнікі мерапрыемства атрымалі салодкія гасцінцы.

ДБ, 17 чал.

12 лютага

Ў рамках пасяджэння клуба “Пунцовая кветачка” прайшоў час ведаў “Берегите природу”. Ўдзельнікі мерапрыемства, вучні 5-7 класаў, уважліва слухалі аповед бібліятэкара пра хараство роднага краю, актыўна адказвалі на пытанні тэматычнай віктарыны. Пераможцы атрымалі салодкія прызы.

Буховічская СБ, 12 чал.

15 лютага

На гадзіну зносін “Культура  взаимоотношений” сабраліся вучні сярэдніх класаў. Дзеці праслухалі некалькі апавяданняў са зборніка “До первой звезды”, правялі дыскусію па прачытаным. Ў канцы  ўсё разам сфармулявалі галоўныя правілы камунікавання, пабудовы стасункаў, успомнілі прыказкі пра сяброўства, пазнаёміліся з літаратурай, прадстаўленай на выставе  “В дружбе – сила!”.

Залеская СБ, 15 чал.

21 лютага

Пасяджэнне клуба “Гаспадынька” “Когда и слово нам душу врачует” (бяседа з бацюшкам). Прысутным бацюшка даў адказы на іх шматлікія пытанні, большасць з якіх звязана з пастом, паводзінамі ш царкве, паняццем граху. Таксама прысутныя змаглі задаць бацюшку свае асабістыя пытанні і атрымаць на іх адказы ці параду, дзе пра гэта можна прачытаць.

Акцябрьская СБ, 10 чал.

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтаваны сцэнарый "Беларускай байкі ўладары" ў дапамогу правядзення мерапрыемстваў, прысвечанных беларускай байцы і 120 - годдзю з дня нараджэння Кандрата Крапівы.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81